Штомесячны навукова-тэарэтычны і інфармацыйна-метадычны часопіс

Выдаецца са студзеня 1992 года

7-8 (19-20) 1993

# АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

## Образование и воспитание
*
## Education and upbringing
*
## Bildung und Erziehung

Репозиторий БарГУ

МІНСК
1993

# Змест


*Г. У. Швяцова.* І ажываюць спадчыны старонкі... Інтэрв'ю з А. В. Мальдзісам 4
*В. І. Маслоўскі.* Родная мова і суверэнітэт 12
*А. А. Каляда.* Разнастайнасць творчай палітры 16
*С. Ф. Русава.* Да пытання аб беларускай школе 21
*В. С. Болбас.* Беларускі асветнік Саламон Рысінскі 26


## Навука. Практыка


*В. А. Гапановіч, Я. А. Трахімовіч, А. А. Крукава, А. М. Давыдок, Г. Р. Штэйнман, В. Ф. Саннікава.* Другая палова дня ў школе 34
Дзяржаўная праграма развіцця вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь ва ўмовах рыначных адносін (Праект) 39
Канцэпцыя развіцця сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (Праект) 46
*Г. І. Шатон, А. С. Кароткіна, Д. В. Куранькоў, А. В. Шаўлюкевіч.* Новыя праграмы. Асновы сучаснай цывілізацыі 67
*М. Ф. Печанко.* Па шляху цывілізацыі 79
*У. Ф. Валадзько.* Сацыялізацыя падрастаючага пакалення 86
*Я. Л. Коломинский.* Учитель в школьном классе 93
*С. В. Белахвостава.* Псіхалагічная культура настаўніка 100
*В. М. Ушакова.* Колькі спецыялістаў нам патрэбна? 105
*А. І. Барадзіна.* Homo humanus 112


## Інфармацыя


*Ю. У. Маслаў.* Амерыканская школа: "кааператыўнае навучанне" 120
Хроніка 125
*У. М. Кісялёў.* Таемны свет паэта 129
*У. П. Біран.* Камп'ютэр і гігіена 137
Каляндар педагога 142
*А. В. Гурына, Г. Я. Ясвінаў.* Як пераадолець крызіс навукі 148
Кароткі руска-беларускі педагагічны слоўнік 157


Рэпазіторый БарДУ



*Праз вечнае — да чалавечнага*

**_А. І. Барадзіна,_**
***настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 1 г. Баранавічы***

# Homo humanus

Не сціхаюць і, пэўна, ніколі не сціхнуць бясконцыя спрэчкі аб уроку літаратуры. Адны ўпарта настойваюць на тым, што ён такі ж, як іншыя, галоўнае тут — веды. Глыбокія, трывалыя. Што ж, сапраўды, пазнаёміцца з пісьменнікам, прачытаць кнігу — мала. Тое і другое трэба ведаць.

Іншыя, наадварот, сцвярджаюць: уменні і навыкі — вось мэта кожнага ўрока. Чытаць, напрыклад, Купалу і нічаму ў яго не навучыцца, — гэта, па сутнасці, не ведаць яго і, тым больш, не ўмець хоць крышачку быць ім — чарадзеем слова, уладальнікам думак.

А ёсць і такія, хто бачыць задачу ўрока літаратуры зусім у іншым: адкрыць школьніку ўсю глыбіню чалавека і складанасці яго жыцця, дапамагчы праз кнігу вызначыць у навакольным свеце ўласнае месца. Толькі растрывожаная душа здольная ў поўнай меры выхаваць у кожным з нас чалавека — гэтыя словы вядомага расійскага педагога Я. М. Ільіна можна паставіць эпіграфам да кожнага сапраўднага ўрока літаратуры.

Якія творы трывожаць нашы душы? Тыя, што ім сугучны. А ці задумваўся хто з аўтараў школьнай праграмы, калі ўключаў у яе той ці іншы твор, наколькі ён цікавы дзецям, адпавядае іх "душы цудоўным памкненням"?

Нельга ператвараць падручнікі па літаратуры ў прапагандысцкія дапаможнікі. У нас жа, як гэта ні парадаксальна, мастацкасць нярэдка і цяпер вымяраецца ідэйнасцю.

У празмернай ідэалагізацыі праграмы існуе яшчэ адзін бок. Да сённяшняга дня мала хто ведае, што побач з Купалам і Коласам у нас ёсць такі класік, як Максім Гарэцкі, нічога школьнік пакуль што не ведае

Рэпазіторый БарДУ

пра Алеся Гаруна, Андрэя Мрыя... Ды ці мала імёнаў могуць падоўжыць гэты спіс!

Ї яшчэ адна асаблівасць: як мы адных пісьменнікаў стараемся схаваць ад вучняў, гэтак другіх імкнёмся як мага больш прыхарошваць, абагаўляць. Раней зусім спакойна маглі выкрасліць з іх біяграфій факты, якія не вельмі глядзеліся на фоне нашых "аптымістычных і жыццесцвярджальных ідэй". Цяпер пайшла тэндэнцыя ў супрацьлеглы бок.

Асноўны аспект гуманізацыі навучання — узмацненне ўвагі да асобы: і вучня, і пісьменніка, і літаратурнага героя (як чалавека, а не як рупара пісьменніцкіх ідэй). Чаму я аб гэтым гавару? Ды таму, што для нашых вучняў беларускія пісьменнікі — усе на адзін твар. Усе аднолькавыя. Усе пісалі пра цяжкае жыццё селяніна ды заклікалі змагацца за зямлю і волю. Такімі робяць пісьменнікаў нашы падручнікі. Робяць сваёй празмернай навуковай, бяздушнай, поўнай банальнай патэтыкі і штампаў мовай, усё той жа заідэалагізаванасцю.

У сваіх дзесятых класах з паглыбленым навучаннем я амаль не карысталася падручнікамі: 4 уступныя гадзіны і 12 купалаўскіх мне дапамагла правесці кніга Барыса Сачанкі "Сняцца сны аб Беларусі", якая можа стаць настольнай для кожнага творчага настаўніка. Пазнаёміўшы з ёю сваіх выхаванцаў, вы можаце быць упэўненымі: яны больш ніколі не зблытаюць этапы жыцця Коласа і Купалы, асаблівасці творчага метаду кожнага з гэтых паэтаў. Яны даведаюцца, што Купала 30-ых гг. — не толькі паэт, які пажынае славу, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, ардэнаносец. Ён і паддоследны органаў дзяржаўнай бяспекі, сын раскулачанай маці, сумленны чалавек, які выбірае "смерць фізічную, чымся незаслужаную смерць палітычную". Ї толькі шчаслівы выпадак дорыць яму яшчэ 12 год жыцця да таго страшнага чэрвеня 1942-га. А больш чым сціплая інфармацыя "памёр у 1942 годзе ў гасцініцы "Масква" нагадае пра загадку смерці паэта, ключы ад якой прапануе ў сваім даследаванні Барыс Сачанка.

Або "Дзённікі" Кузьмы Чорнага, апублікаваныя яго дачкой у 1988 г. у "Полымі". Выпускнікі бойка называюць яго "бацькам беларускага рамана", тым самым узводзячы пісьменніка на п'едэстал , а, між іншым, апошнія месяцы яго жыцця прайшлі ў спадзяванні дачакацца ціхага кута, каб пісаць. Ї крык душы: "У мяне ўжо няма 70% здароўя. Я гіну і не магу выкарыстаць як бы трэба было свой талент. Сілы мае трацяцца і марнуюцца без карысці... Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?" Такія словы ўздзейнічаюць на вучняў значна мацней, чым самыя напышлівыя, але зацёртыя, як медныя пятакі, сентэнцыі.

Неабходнай умовай гуманізацыі выкладання літаратуры я лічу вось такое, у добрым сэнсе слова, звядзенне пісьменнікаў з п'едэстала, бо яны ж таксама людзі — са сваімі сумненнямі, слабасцямі, недахопамі. Людзі, пазначаныя божым дарам — талентам.

Ці часта мы з вамі ў штодзённай мітусні глядзім у неба? Гэтае пы-



Репозиторий БарГУ

танне я задала сабе, пакутліва разважаючы аб тым, чаму ў школе так цяжка ідзе паэма "Новая зямля". Цяжка, нягледзячы на тое, што сам твор цікавы, шматпланавы. Але Колас піша аб добра яму знаёмым, родным, асабіста перажытым. У першую чаргу паэма — энцыклапедыя прыроды. А што бачаць нашы гарадскія дзеці? Каб выклікаць цікавасць да паэмы, я сама для сябе перафразавала вядомае выказванне: ад гумарыстычнага да сур'ёзнага — адзін крок. Тым больш, што гумар коласаўскі цяжка параўнаць з якім-небудзь іншым.

Мы, настаўнікі, рэдка ўсміхаемся на ўроках, лічачы, што тут усмешкі не да месца, а ўжо жарты і смех — прамое парушэнне дысцыпліны. Асабіста ж я скарыстоўваю кожную магчымасць, каб пажартаваць ці пасмяяцца. І менавіта праз акцэнт на гумар мне ўдалося скіраваць дзевяцікласнікаў на чытанне паэмы "Новая зямля". А вось з прыродай справы склаліся цяжэй.

Пакладзіце руку на сэрца і прызнайцеся сабе, ці не перагортваеце вы самі, не чытаючы, апісанні пейзажу, каб хутчэй прасачыць сюжэт? Са мною таксама часам бывае такое. Але "Новая зямля" без пейзажу — гэта нешта накшталт галавы без шыі. І тады я прыдумала выйсце: папрасіла вучняў знайсці добры пейзажны малюнак ці здымак. "А подпіс да яго, да любога, на ўсе выпадкі жыцця, вы знойдзеце ў паэме, бо яна ж — энцыклапедыя прыроды", — такім было дамашняе заданне. Вынікі пераўзышлі ўсе мае чаканні — такая разнастайнасць малюнкаў з подпісамі паўстала перада мной. І мы зрабілі цудоўны альбом "Пейзажныя карціны ў паэме "Новая зямля". Такім чынам я змагла дабіцца таго, каб дзеці перачыталі апісанні пейзажу ў паэме, прычым зрабілі гэта ўдумліва і творча.

Нельга сказаць, што нашы вучні — дрэнныя дзеці, што ў іх халодныя сэрцы. Хаця нам, дарослым, часта зручней так думаць і вытлумачваць свае пралікі. Дзеці як дзеці. Але гэта іншыя людзі, яны фарміруюцца ў іншы час, а мы падаём ім старыя слоўныя канструкцыі, карыстаемся сцёртым эмацыянальным радам, замест таго каб шукаць новы, больш блізкі ім. Варта ў мінулым адшукаць нешта такое, што яму, маладому чытачу, стала б патрэбным цяпер. Напрыклад, пытанне аб зямлі, якая сёння для нашых гарадскіх вучняў не ўяўляе матэрыяльнай каштоўнасці (а тэарэтычна прывіць любоў да зямлі вельмі цяжка, калі ўвогуле магчыма).

Мы, урбанізаванае пакаленне, усё ж мелі ў асноўнай сваёй масе вясковае дзяцінства і дагэтуль жывімся тымі ўспамінамі, а вось мае адзінаццацікласнікі ў мінулым годзе доўга і шчыра дзівіліся Сцепанідзе з быкаўскага "Знаку бяды", якая цяжка перажывала гібель сваёй кароўкі. "Дурная жанчына, — думалася ім. — Ляжы сабе, адпачывай, ніякага клопату". Слухаць гэта было не смешна, а горка, бо спрадвечныя рысы беларускага нацыянальнага характару дэфармаваліся ці наогул страчаны, і адной тэорыяй, адной літаратурай тут рады не дасць нават самы таленавіты, ад бога, настаўнік.

Рэпазіторый БарДУ

Колькі гадоў праграма давала нам наступны арыенцір: "У працэсе вывучэння літаратуры важна звярнуць асаблівую ўвагу на творы савецкіх пісьменнікаў, у якіх увасоблены вобразы рэвалюцыйных барацьбітоў, баявыя, працоўныя подзвігі савецкага народа". Атрымліваецца, што творы, якія выхоўваюць у дзяцей любоў да прыроды, абуджаюць цікавасць да сваёй далёкай мінуўшчыны, — другарадныя? Ва ўсякім разе, пра іх у праграме — ні слова. Таму мы і маем тое, што маем.

З уласных вучнёўскіх будняў я памятаю, як моцна залежыць цікавасць да прадмета ад узаемаадносін з настаўнікам, нават больш таго: у свядомасці вучняў яны (настаўнік і прадмет) проста асацыіруюцца, амаль што атаясамліваюцца. Прыемна, калі дзеці на пытанне "Які ў вас наступны ўрок?" адказваюць радасна, а не крывяцца ад перспектывы перасумаваць сорак пяць хвілін. А настаўнік жа эксперыментальнага класа, якім у дадзеным выпадку з'яўляюся я, як хірург, не мае права на памылку. Інакш гэты эксперымент ён пахавае ўласнымі рукамі.

Асобу можа выхаваць толькі асоба. Мы ж, настаўнікі літаратуры, якія прафесіяй сваёй абавязаны быць людзьмі высокай культуры, пастаўлены ў такія ўмовы, што павінны рабіць выбар: альбо цярпліва цягнуць воз з вучнёўскімі сшыткамі, альбо сачыць за ўсім новым у літаратурным і культурным жыцці.

Вазьму на сябе смеласць сказаць і наступнае: як бы настаўнік літаратуры ні гуманізаваў стыль і метады выкладання, атмасферу на ўроку — гэта не дасць плёну без дыферэнцыяцыі навучання. Яна, як і модная сёння дэмакратызацыя (якую, дарэчы, кожны разумее па-свойму), з'яўляецца зыходным момантам для выхавання асобы. Асабліва яскрава я адчуваю адсутнасць дыферэнцыяцыі ў сваіх паглыбленых класах, якія сталі такімі проста па загадзе зверху. Нават не па ўласным жаданні вучняў, не кажучы ўжо аб іх схільнасцях і здольнасцях. Пасля першага паўгоддзя нашай работы толькі 9 з 35 чалавек назвалі беларускую літаратуру ў ліку любімых дысцыплін. І замест таго каб навучаць свайму прадмету тых, хто на самой справе ім цікавіцца, даводзіцца з дня ў дзень пераадольваць супраціўленне вучняў, якія не праяўляюць да літаратуры ні цікавасці, ні здольнасцей. Я ўжо не кажу пра бацькоў, якім толькі застаецца назіраць збоку за гэтай барацьбой.

Але калі бачу я, што закаранелы троечнік прачытаў твор і нясмела цягне руку, я дам яму поўную магчымасць "бліснуць" сваімі ведамі, адчуць сябе маім паўнапраўным субяседнікам і атрымаць пяцёрку. Некаторыя, праўда, пасля такога імклівага ўзлёту адразу расслабляюцца і на наступным уроку "почивают на лаврах", але ёсць і шчаслівыя выключэнні, якія даказваюць, што гуманізацыя атмасферы на ўроку дае свой плён.

Як і ў большасці маіх калег, у мяне ёсць любімы клас. Назваць яго лепшым язык не паварочваецца, але, як піша Д. Гранін у "Зубры", "для любви нужны не только достоинства". У гэтым класе ніколі не бывае цішыні. Дзеці настолькі эмацыянальныя, што рэагуюць на ўсё



Рэпазіторый БарДУ

разам. Мяне напачатку гэта крыху бянтэжыла, я намагалася стварыць ілюзію парадку, але своечасова зразумела, што нават калі нейкімі карнымі мерамі і даб'юся ціпшыні, то гэта будзе ўжо не той клас, які мне так падабаецца.

Кожны настаўнік ведае такія ўрокі, калі, як пасля сеанса гіпнозу, аддаеш усю энергію і адчуваеш у поўнай меры тое, што называецца сухімі словамі "зваротная сувязь". Але бывае і так, што "кладзешся касцьмі" — і ніякай табе зваротнай сувязі. І сілы пакідаюць цябе зусім не адпачасця.

Вось мне і хацелася б на заканчэнне артыкула расказаць пра ўрокі, якія парадавалі сваёй атмасферай ды і вынікамі. Яны з серыі тых заняткаў, якія ўкладваюцца ў даволі простыя кірункі-пастулаты:

1. Пошукі лепшага ў чалавеку.

2. Яго (пісьменніка, героя) паказаць і сябе (даследчыка, настаўніка, каментатара) не забыць.

Па другім кірунку ў IX класе прайшоў урок на, здавалася б, сёння не дужа спрыяльную тэму — "Уз'яднанне Беларусі з Расіяй і яго значэнне для гістарычнага развіцця беларускага народа. Сувязь літаратуры з вызваленчым рухам". Асноўнай задачай для вучняў на ўроку было паказаць сябе ў якасці даследчыкаў. Гэта тэма сёння трактуецца крыху інакш, чым, скажам, яшчэ пяць гадоў назад. Я не імкнулася навязваць дзецям сваёй думкі, хацелася, каб яны мелі ўласнае меркаванне. Таму пайшлі такім шляхам: пазнаёміліся з матэрыялам падручніка, нагадалі, якая палеміка вядзецца па дадзеным пытанні ў перыядычным друку. Склалі табліцу, у якой занатавалі і станоўчае, і адмоўнае. Кожны меў магчымасць выказацца, і трэба сказаць, плённа ёю карыстаўся. На ўроку я пазнаёміла вучняў з кнігай "Кароткі агляд Беларусі", выдадзенай у Нью-Йорку. Нягледзячы на яўную тэндэнцыйнасць некаторых артыкулаў, многія яе матэрыялы вельмі каштоўныя ў пазнавальным плане. Работа з гэтай кнігай з'явілася спробай навучыць старшакласнікаў арыентавацца ў шквале самай супярэчлівай інфармацыі і, дарэчы, спробай удалай. Табліцы ў асобных вучняў адрозніваліся колькасцю дадатных і адмоўных фактаў, што сведчыць аб самастойнасці думкі. Прааналізаваўшы ўсе факты, мы не сталі ставіць кропкі над "і", бо такой смеласці пакуль што не возьме на сябе ні адзін гісторык. Вывад, зроблены намі сумесна на ўроку, быў наступны:

беларусы самі запрашалі велікаросаў, наладжвалі сувязі з імі, здраджвалі палякам, але, як толькі адчулі на сабе цяжар маскоўскага кіравання, пачалі памалу зноў цягнуцца да Польшчы, дзе характар эканамічных адносін быў зусім не такі, як у Маскоўскай дзяржаве. Так што справа тут не ў "крыважэрнасці" рускага народа, які "сабраўся праглынуць" беларусаў, а ў дзяржаўна-палітычнай сістэме, якая, дарэчы, і самую цэнтральную Расію на сёння ператварыла проста ў Нечарназем'е.

У чым каштоўнасць такога ўрока? У тым, што вучань пастаўлены ў

становішча даследчыка, што ён мае магчымасць праявіць сябе як асобу. Яму аказаны давер, праяўляецца цікавасць да яго ўнутранага свету, да яго спосабу мыслення. На такім уроку вучань і настаўнік роўныя.

Да кірунку "Пошукі лепшага ў чалавеку" найбольш стасуюцца ўрокі па творчасці В. Быкава, у прыватнасці па яго аповесці "Жураўліны крык". Афіцыйнае літаратуразнаўства, а за ім і школьны падручнік аперыруюць паняццямі "адмоўны персанаж", "станоўчы персанаж". Але гэтак, як і багацце фарбаў, нельга перадаць толькі чорным і белым колерамі, немагчыма ўсе праявы чалавечай сутнасці ўціснуць у два супрацьлеглыя паняцці. Быкаў заўсёды ставіць свайго героя ў трагічныя абставіны, паказвае ў хвіліну, "якой страшней не будзе", калі чалавек знаходзіцца на мяжы жыцця і смерці. Як ён паводзіць сябе ў такія хвіліны, што думае, якія зрухі адбываюцца ў яго душы — усё гэта і стала прадметам адлюстравання. Галоўнае, што пісьменніка цікавяць вытокі здрады і гераізму на вайне.

Пачынаючы вывучэнне аповесці "Жураўліны крык", мы запісалі шэраг пытанняў, на якія меліся адказаць у час работы над творам:

што ёсць памылка, а што тэндэнцыя, пазіцыя і нават злачынства?

У чым віна чалавека, а ў чым бяда?

Чаму ёсць апраўданне, а чаму — няма?

Ці ўсё ў жыцці залежыць ад чалавека? Ці бываюць абставіны, мацнейшыя за яго?

Што залежыць ад чалавека, калі магчымасці перамагчы абставіны вычарпаны ім да канца?

Адказаць на гэтыя пытанні, разважаючы над лёсам кожнага героя, — задача вучняў. Каб не рассейваць увагі на лішнія дэталі, я зрабіла так: пасля чытання першага раздзела, дзе Быкаў паказвае ўсіх байцоў у час, калі яны акопваюцца, кожны адзначыў, да каго з герояў адчувае большую ці меншую сімпатыю. Адпаведна клас падзяліўся на групы (а іх было якраз шэсць), удзельнікі якіх засяродзіліся на асобным варыянце і дэталёва вывучалі-прыглядаліся да свайго героя. Працуючы над творам, вучні сочаць, як спакваля кожны герой прыходзіць да канчатковага выбару, што гэтаму спрыяе. Яны ўпэўніваюцца ў тым, што знешнасць чалавека не заўсёды , мякка кажучы, адпавядае яго ўнутранаму зместу. Асабліва давялося расчаравацца дзяўчатам, якія з першай старонкі аповесці аддалі перавагу чарняваму, прыгожаму Аўсееву. Затое жулікаваты на выгляд Свіст, які да таго ж, як высвятляецца, сядзеў да вайны ў турме, аказваецца здольным на подзвіг. Найбольш жа складаны вобраз — Пшанічны. Гутарка аб імператварылася ў гарачую дыскусію. Адны апраўдвалі героя, іншыя абвінавачвалі, і кожны прыводзіў неаспрэчныя аргументы. Пяць урокаў па гэтай аповесці ператварыліся ва ўрокі чалавеказнаўства. Вывады, якія былі зроблены ў канцы заняткаў, коратка можна сфармуляваць наступным чынам: чалавек павінен заставацца чалавекам да канца. Самае галоўнае — ягоная стойкасць

перад жорсткай сілай абставін. Тыя, хто не супрацьстаяў ім на працягу свайго жыцця, пакарыліся і ў момант выбару.

Закончыць мне хацелася б словамі пісьменніцы Святланы Алексіевіч: "Мы выхавалі людзей, якія могуць без ваганняў кінуцца на зямлю, каб абясшкодзіць вынырнуўшы праз 40 год іржавы снарад і падарвацца на ім, выцягнуць дзіця з агню, рызыкуючы жыццём, — і дзякуй богу, што такіх людзей нямала. Але ці шмат тых, хто не будзе падтакваць начальству, калі ў душы не згодны з ім, хто мае асабістую думку, не здрадзіць сябру? Навучыць і выхаваць такога чалавека няпроста. Няпроста дабіцца таго, каб ён самастойна думаў, не прымаў усё на веру, а сумняваўся, сам праз нястомную працу розуму і сэрца даходзіў да разумення сутнасці жыццёвых з'яў, падзей і на аснове гэтага вызначаў сваё месца ў грамадстве". Такую праўду жыцця, гісторыю нашай Радзімы, непрыгладжаную, нелакіраваную, з усімі яе супярэчнасцямі, такі свой маральны вопыт павінен данесці да вучняў настаўнік!

*Overideologization must be replaced by humanization of literary education at school. It's an obligatory condition for promotion of the interest to the study of native literature on the one hand and more effective moral upbringing of pupils, development of the youth's personality on the other. The teacher of Slonim' secondary school № 2 in Grodno region A. I. Borodina considers so and writes about in her article.*

*An Stelle der Jdeologie muB eine Literaturbildung in die Schule kommen. Es ist eine unbedingte Voraussetzung, um ein Interesse zur belorussische Literatur, eine Personlichkeit mit dem Wert und mit der Selbstsucht, die moralischen Prinzipien zu erneuert.*
*So glaubt die Lehrerin der Schule № 2 ans Slonim (Grodnogebiet) A. Borodina.*

Рэпазіторый БарДУ